Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ВЕРАСНЯ 2007 г. ЧАЦВЕР
№ 168 (26033)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

## Працоўны кодэкс, калектыўны дагавор «адпачываюць». Плаціць аванс ці не — вырашае асабіста адміністрацыя гаспадаркі

**Даярка з СВК «Баравое» Дзяржынскага раёна Зоя Віктараўна Шаблоўская адна выхоўвае 11-гадовую дачку. Літаральна напярэдадні Дня ведаў у гаспадарцы павінны былі даваць аванс, на які жанчына вельмі разлічвала, бо трэба было тэрмінова рыхтаваць дзіця да навучальнага года, купляць усё патрэбнае. Аднак грошай асабіста Зоі Віктараўне не далі.**

— Кожны год мы павінны праходзіць планавую медкамісію. Я не паспела прайсці абследаванне літаральна ў аднаго ўрача, паколькі трэба было адседзець ці не цэлы дзень, а такой магчымасці ў мяне тады не было. На падставе гэтага — што я не прайшла цалкам медкамісію — галоўны заатэхнік гаспадаркі Дзмітрый Дзянісаў аддаў распараджэнне не выдаваць мне аванс. А дзіцяці ж у школу ісці, — паведаміла нам па тэлефоне Зоя Віктараўна.

Згодна з артыкулам 49 «Адхіленне ад работы» Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, наймальнік мае права не дапускаць да работы (адхіліць ад работы) у адпаведны дзень (змену) работніка, які не прайшоў медыцынскі агляд у выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам. Сувязі з выплатай авансу тут не можа быць ніякай, за выключэннем выпадкаў, калі чалавек, напрыклад, за разліковы месяц не меў працоўных дзён (скажам, быў у водпуску, тады плаціць сапраўды няма за што). На жаль, на працягу канца мінулага—пачатку гэтага тыдня пагаварыць на гэтую тэму з галоўным заатэхнікам СВК «Баравое» Дзмітрыем Дзмітрыевічам Дзянісавым не атрымалася — яго тэлефон маўчаў. Таму рэдакцыя мусіла звярнуцца па дапамогу да начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Дзяржынскага выканкама Міхаіла Смольскага. Апошні паабяцаў праверыць усе выкладзеныя факты і аператыўна праінфармаваць нас аб выніках. На працягу некалькіх дзён і сам Міхаіл Аляксандравіч, і начальнік аддзела працоўных адносінаў упраўлення Віктар Даманеўскі перыядычна падтрымлівалі сувязь з рэдакцыяй. Вось які малюнак склаўся ў выніку.

Па-першае, даярка Зоя Віктараўна Шаблоўская ў разліковым месяцы працавала, прычым без выхадных, так што на атрыманне авансу мела поўнае права. Так, да яе былі пэўныя прэтэнзіі, але, яшчэ раз падкрэслім, да выплаты авансу яны не маюць ніякага дачынення.

Па-другое, згодна з артыкулам 73 «Тэрміны і перыядычнасць выплаты заработнай платы» Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, выплата заработнай платы адбываецца рэгулярна ў дні, вызначаныя ў калектыўным дагаворы, пагадненні або працоўным дагаворы, але не радзей як два разы ў месяц. Дарэчы, у калектыўным дагаворы, удакладнілі нам у райвыканкаме пасля праверкі, такі пункт ёсць, і аванс павінен складаць за 40 працэнтаў ад памеру заробку.

Па-трэцяе, высветлілася цікавая рэч, пра якую гаварыла нам Зоя Віктараўна і якую пацвердзіў пасля праверкі Міхаіл Смольскі. Аказваецца, не тое, што кіраўнік СВК, але нават спецыялісты гаспадаркі могуць аддаць распараджэнне бухгалтэрыі ў дачыненні да таго ці іншага работніка кшталту «аванс не даваць» па прычынах, аналагічных нашай. Прычым такое здаралася ўжо не аднойчы.

У дачыненні да даяркі Шаблоўскай такое распараджэнне аддаў, нагадаем, галоўны заатэхнік Дзянісаў. Кіраўнік СВК Рыгор Іванавіч Нікалаевіч на той час быў на бальнічным, але, калі выйшаў на працу, фактычна падтрымаў дзеянні свайго падначаленага. Як зазначыў Міхаіл Смольскі, «у тэлефоннай гутарцы кіраўнік выказаўся катэгарычна супраць выплаты авансу вашай заяўніцы».

Пакуль вялося высвятленне ўсіх гэтых нюансаў, Зоя Віктараўна была запрошана на сустрэчу да намесніка старшыні райвыканкама. Паводле слоў начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Міхаіла Смольскага, яе вынікамі жанчына засталася задаволеная. «Прынята рашэнне аб выдзяленні даярцы СВК «Баравое», якая адна выхоўвае непаўналетнюю дачку, аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ў памеры 100 тыс. рублёў — для падрыхтоўкі на навучальнага года». Як дадаў Міхаіл Смольскі, пра сітуацыю вакол выплаты авансу ў СВК «Баравое» (дакладней, паводзіны спецыялістаў і кіраўніка ў дачыненні да работнікаў) праінфармаваны старшыня райвыканкама. Пасля больш уважлівага вывучэння здарэння (хацелася б спадзявацца, што не толькі яго, але і папярэдніх выпадкаў таксама — **С.Р.**) у адносінах да адміністрацыі сельскагаспадарчага прадпрыемства будуць прыняты адпаведныя меры. Таму рэдакцыя просіць лічыць гэтую публікацыю афіцыйным зваротам.

**P.S.** *Калі матэрыял ужо быў падрыхтаваны, зноў патэлефанаваў Міхаіл Смольскі: «Літаральна сёння Зоі Віктараўне Шаблоўскай быў выплачаны належны ёй аванс».*

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

А на мой погляд...

## Рэагуючы на несправядлівасць, мы пазбягаем канфліктаў

**Тое, што адбылося з даяркай СВК «Баравое» Дзяржынскага раёна Зояй Віктараўнай Шаблоўскай, як мінімум можна назваць несправядлівасцю. Не будзем абмяркоўваць прававы бок праблемы (гэта асобная тэма), звернем увагу найперш на так званы чалавечы фактар: адзін (ці некалькі) чалавек вырашылі пакараць іншага, прычым, беспадстаўна...**

**А ВАМ У ЖЫЦЦІ ЧАСТА ДАВОДЗІЦЦА СУСТРАКАЦЦА З НЕСПРАВЯДЛІВАСЦЮ — У ДАЧЫНЕННІ ДА СЯБЕ, ІНШЫХ ЛЮДЗЕЙ? ЯК ВЫ ЗВЫЧАЙНА РЭАГУЕЦЕ Ў ТАКІХ СІТУАЦЫЯХ НА НЕСПРАВЯДЛІВАСЦЬ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА ВАШЫХ ВАЧАХ?**

***Людміла КЛІМОВІЧ, начальнік планавага аддзела РУП «Валожынскі жылкамунгас»:***

— Вельмі складанае пытанне... Нават не ведаю, як адразу адказаць на яго. Апошнім часам падобных несправядлівасцяў у маім жыцці, на шчасце, не было. А ўвогуле ў такіх канфліктных сітуацыях я найперш прамаўчу, трымаю, як кажуць, усё ў сабе. Так, я ведаю, што гэта дрэнна, але такі ў мяне характар. Вельмі рэдка я магу абмеркаваць якую-небудзь несправядлівасць у дачыненні да мяне ў сям'і ці з сяброўкай, напрыклад. А выказаць нешта ў вочы таму, хто паступае несправядліва... Не, гэтаму я не навучана.

***Вікенцій МОНЦІК, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Ганцавіцкага райвыканкама:***

— Часта сутыкаюся з несправядлівасцю: і ў дачыненні да сябе яе хапае, але ж яшчэ больш я бачу несправядлівасці ў адносінах да іншых. Як стаўлюся да такіх сітуацый? Шчыра скажу: не маўчу, але і на плошчу не выходжу, не крычу. Канешне, мне прасцей адстойваць справядлівасць у адносінах да іншых, чым да самога сябе. Але я выхаваны ў тым духу, што высвятляць усё трэба спакойна, без крыку, аргументавана. Не заўсёды, але даводзілася пераконваць, што тыя ці іншыя дзеянні аднаго чалавека ў дачыненні да другога былі несправядлівымі: недзе 50 на 50, калі гаварыць асабіста пра сябе, і значна больш — калі пра іншых.

***Марына БОДА, загадчык сектара матэрыяльна-бытавога абслугоўвання ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне Старадарожскага райвыканама:***

— Так, часта сутыкаюся, асабліва на працы. Я заўсёды імкнуся пазбегнуць канфлікту. Чаму? Каб не зачапіць, не пакрыўдзіць чалавека. Увогуле, чым мацней на мяне крычаць, тым цішэй я размаўляю. Нам даводзіцца выслухоўваць скаргі і розныя нараканні ад пенсіянераў, інвалідаў, людзей з невялікімі даходамі. Асабіста я, як чалавек, да іх праблем дачынення не маю, але ўсе свае негатыўныя эмоцыі яны накіроўваюць на мяне як на спецыяліста. Але ёсць законы, якіх мы павінны прытрымлівацца, нават калі чалавеку гэта не зусім падабаецца. Так, часта даводзіцца стрымліваць сябе, хаця зрэдку, як і ў любога чалавека, здараюцца «выбухі». У такіх сітуацыях я шукаю выйсце, напрыклад, звяртаюся да «трацейскага суддзі».

***Сяргей ГОЦМАНАЎ, начальнік Чачэрскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях:***

— Усё залежыць ад абставінаў, паколькі аднолькавых рашэнняў не бывае. Трэба ўважліва разабрацца ў той ці іншай сітуацыі, паколькі часам, імкнучыся дапамагчы, можна, наадварот, нашкодзіць. Калі ў чалавека сапраўды бяда, буду імкнуцца яму дапамагчы, прыцягнуць увагу навакольных. Хаця, скажу шчыра, абараняць самога сябе мне прасцей, бо я валодаю ўсёй інфармацыяй. У дачыненні да іншага, паўтаруся, трэба быць вельмі ўважлівым. Ну а «выбухі»... Яны ў кожнага бываюць, галоўнае — зразумець іх прычыну. Калі я дзесяць разоў запар спатыкнуся аб камень, натуральна, з'явіцца нейкая злосць. Але на каго — на камень ці на самога сябе я павінен злавацца?!

***Гэта ж самае пытанне мы задалі і самой Зоі ШАБЛОЎСКАЙ — дакладна так, як і ўсім іншым рэспандэнтам.***

— Вельмі часта, вельмі-вельмі. Калі выхоўвала старэйшую дачку (яна ўжо замужам) гадоў да 14-ці, а малодшай было два гады, падаецца, жыць было лягчэй. Нават адной з двума дзецьмі, бо ад людзей я адчувала больш разумення. А зараз... Людзі, напэўна, ачарсцвелі. Толькі дзякуючы сваім дзвюм суседкам я магла нядаўна купіць хлеб, сшыткі для дачкі. Я ж нікому асабліва не скардзілася, бо ёсць людзі, каму, магчыма, яшчэ горш. Навошта абцяжарваць іншых сваімі праблемамі? Прыйду дадому, паплачу ў падушку — у душы ўсё і перакіпіць. Да школы дачцэ не паспела купіць абутак і партфель. Яна мусіла абуць старыя пантофлі сястры, а ў рукі ўзяць пакет. Дзеці смяяліся, дачцэ было крыўдна. Дзякуй, што дапамаглі, зараз змагу набыць да школы ўсё, на што раней не было грошай.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## СП'ЯНУ І ЗДУРУ

учыніў хуліганства сярод белага дня 35-гадовы жыхар Драгічына. Ён зайшоў у магазін «24 гадзіны» і падпаліў кашулю на адным з наведвальнікаў. Адзежу на 70-гадовым пакупніку хутка патушылі. Узбуджана крымінальная справа.

**Яна СВЕТАВА.**

ISSN 1990 - 763X



## «Паспрабуй нас адрозніць!»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Васьмігадовыя сёстры-блізняты Дарына і Настасся СЯРГЕЕВЫ з пасёлка Прывольны Мінскага раёна.*

## КАШТОЎНЫЯ КАМЯНІ — У ЦАНЕ...

**За 8 месяцаў гэтага года істотна ўзрос попыт беларусаў на брыльянты, якія насельніцтву рэалізуе Нацбанк: у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам аб'ём продажу каштоўных камянёў у каратах вырас на... 87 працэнтаў, у колькасным выражэнні — на 45 працэнтаў.**

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, усяго насельніцтву рэалізавана 1755 штук брыльянтаў агульнай масай 307,56 карата, а выручка склала 1 млрд 153,1 млн рублёў або 537 тыс. долараў ЗША.

Даволі ахвотна, аб чым сведчыць і апошняя інфармацыя галоўнага банка краіны, людзі інвестуюць свае свабодныя грашовыя сродкі і ў мерныя зліткі, лідарства сярод якіх па-ранейшаму — за залатымі. За шэсць гадоў, што Нацбанк рэалізуе насельніцтву залатыя зліткі, агульная вага купленага каштоўнага металу перасягнула паказчык ў 2 тоны: набыта 2252 кілаграмы залатых зліткаў. У гэтым годзе аб'ём прададзеных зліткаў за 8 месяцаў склаў больш за 425,57 кілаграма або 21 817 штук. Найбольш папулярныя з іх — 10-грамовыя, якіх куплена 5548 штук, або 25,4 працэнта ад агульнай колькасці. Яно і зразумела, бо цана іх параўнальна даступная — 239 долараў за штуку. Ёсць цікавасць у пакупнікоў і да больш важкіх зліткаў — паў- і кілаграмовых. Яны ўжо — для сур'ёзных кліентаў, бо кошт такіх «брусоў» сапраўды кусаецца: цана паўкілаграмовага злітка складае 11 765 долараў, кілаграмовага — 22 785. Тым не менш, сёлета ўжо куплена 20 зліткаў па 0,5 кілаграма і 72 — па 1 кілаграму.

Больш за тону, а менавіта 1170,96 кілаграма з пачатку рэалізацыі прададзена сярэбраных зліткаў. За студзень—жнівень 2007 года аб'ём прададзенага насельніцтву гэтага каштоўнага металу склаў 274,25 кілаграма або 3888 штук. Тут таксама лідарства — за 10-грамовымі зліткамі, якіх набыта 2197 штук. Кошт сярэбраных зліткаў у параўнанні з залатымі куды больш сціплы. Так, цана 10-грамовага сярэбранага злітку складае 9 долараў, а кілаграмовага — 454 долары.

Нарэшце, аб плацінавых мерных зліткаў. На іх попыт найменшы, чаго не скажаш пра кошт. Крыху больш чым за два гады ў Нацбанку куплена 27,84 кілаграма плацінавых зліткаў, за сёлетнія студзень—жнівень — 5,57 кілаграма або 319 штук. Між іншым, цана продажу 5-грамовага злітка зараз складае 233 долары, вагой 0,5 кілаграма — 21 517.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## У Беларусі колькасць ільназаводаў можа быць аптымізавана

**Для максімальнай эфектыўнасці льнозаводы ў Беларусі будуць рэканструяваны ў бліжэйшыя гады. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі на выязной нарадзе па пытаннях развіцця льнянога комплексу рэспублікі, якое прайшло ў Дубровенскім раёне.**

У Беларусі налічваецца 49 ільнозаводаў. «Неабходна прыняць меры, каб гэтыя прадпрыемствы сталі працаваць максімальна эфектыўна, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Ёсць прапановы скараціць іх колькасць да 25, астатнія зрабіць цэхамі або іх філіяламі...».

Прэм'ер-міністр запатрабаваў таксама больш дэталёва прапрацаваць пытанні па далейшай рэканструкцыі льноперапрацоўчых прадпрыемстваў: якое абсталяванне закупляць, на якіх умовах. Сяргей Сідорскі ў якасці прыкладу прывёў Дубровенскі льнозавод. На гэтым прадпрыемстве пры закупцы абсталявання ў кантракце не былі агавораны з пастаўшчыкамі ўмовы па забеспячэнню пусканаладачных работ і выкарыстання тэхналогіі. «Такіх пралікаў у далейшым быць не павінна», — падкрэсліў ён. Сяргей Сідорскі звярнуў увагу на тое, што графікі па ўводу на льнозаводах новых тэхналагічных ліній не выконваюцца. Між тым, паводле яго слоў, урад выканаў усе свае абавязацельствы па фінансаванню праграм, звязаных з вырошчваннем і ўборкай лёну, тэхнічным забеспячэннем гаспадарак. Аказваючы істотную дзяржпадтрымку, ад прадпрыемстваў галіны чакалі больш высокіх вынікаў, яны павінны былі выйсці на рэнтабельную работу. Аднак прадпрыемствы маюць мінусавую рэнтабельнасць на працягу апошніх трох гадоў, адзначыў прэм'ер.

Сяргей Сідорскі даручыў Мінсельгасхарчу і НАН Беларусі ў трохдзённы тэрмін падрыхтаваць прапановы аб магчымасці стварэння сумесных вытворчасцяў па вырабу тэхнікі, неабходнай для льнасеяльных гаспадарак. Паводле слоў Сяргея Сідорскага, урад прымае меры па далейшаму фінансаваму аздараўленню льняной галіны. Ён звярнуў увагу на тое, што Аршанскі льнокамбінат не разлічыўся з ільнозаводамі за пастаўленае яшчэ ў мінулыя гады льновалакно. Такім чынам, пагаршаецца ў цэлым фінансавы стан галіны. Таму будуць прыняты больш жорсткія меры па кантролю за своечасовымі разлікамі за льновалакно. Цяпер рыхтуецца рашэнне аб рэструктурызацыі існуючай пратэрмінаванай запазычанасці Аршанскага льнокамбіната. Сяргей Сідорскі таксама паведаміў, што ў гэтым годзе ў Беларусі павінна быць атрымана не менш як 60 тыс. тон ільновалакна.

**БЕЛТА.**

## ПРАПАНОВЫ ПА СПРАШЧЭННЮ АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭДУР АДНОСНА ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБАЎ І ІП БУДУЦЬ ВЫПРАЦАВАНЫ ДА 20 ВЕРАСНЯ

Адпаведнае распараджэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 1102.

**БЕЛТА.**

Аляксандр СУРЫКАЎ:

## «Мы хочам падтрымліваць сялян Беларусі, а не іншых краін»

**Расійскі бок «разглядае магчымасць» павелічэння пастаўкі нафты ў III і IV кварталах, каб Мазырскі НПЗ і ААТ «Нафтан» «больш эфектыўна папрацавалі». Аб гэтым заявіў учора Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў падчас сустрэчы са старшынёй Мінскага аблвыканкама Леанідам Крупцом.**

Гаворачы пра падпісанае ў сакавіку Пагадненне аб мерах па развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі, якое павінна было зняць шэраг абмежаванняў у гандлі, пасол адзначыў, што расійскі бок жадае, каб з яго дапамогай «мы выйшлі на нармальны рэжым падтрымкі ў першую чаргу сельгасвытворцаў».

Гаворачы пра сітуацыю з пастаўкамі цукру з Беларусі ў Расію, пасол нагадаў пра прэтэнзіі да заводаў рэспублікі, якія, па версіі расійскага боку, пад выглядам бураковага пастаўлялі цукар, выраблены з сыравіны, якая імпартавалася ў Беларусь. «Нам вельмі шкада, што мы былі вымушаны паступіць такім чынам, што беларускі бок узяў на сябе самаабмежаванне па пастаўках цукру ў Расію. Сёлета — 180 тыс. тон... Мы зрабілі гэта таму, што не хочам падтрымліваць сялян іншых краін. Мы хочам падтрымліваць сялян Беларусі». У той жа час Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што «калі Беларусь выйдзе на вытворчасць уласнага бураковага цукру, большую за патрэбы краіны, мы гатовыя ўвесь гэты цукар набыць».

Аляксандр Сурыкаў адзначыў таксама падчас сустрэчы, што Расія і Беларусь «выходзяць на нармальнае рашэнне» спрэчкі паміж кандытарамі. «Думаю, на працягу паўгода мы закончым усе «цукеркавыя» спрэчкі». Расійскі бок, паводле слоў пасла, лічыць таксама, што неабходна ствараць доўгатэрміновы баланс вытворчасці і паставак сельскагаспадарчай прадукцыі па асноўных яе відах: збожжа, малако, цукар, мяса, алей. «Гадоў на дзесяць. Каб мець рысу, да якой мы павінны імкнуцца. Нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, вярстаць адпаведныя праграмы...»

Пасол заявіў таксама, што Расію «цікавяць далейшыя інтэграцыйныя працэсы ў галіне прамысловай вытворчасці». Пры гэтым ён паведаміў, што нядаўна была адкрыта зборачная вытворчасць «Гомсельмаша» ў Бранску, вытворчасць Мінскага трактарнага завода ў Мардовіі.

Сярод праблем, якія існуюць у прамысловым узаемадзеянні, — недахопы ў галіне сэрвіснага абслугоўвання. У прыватнасці, «трэба разабрацца з пытаннямі сэрвіснага абслугоўвання ва Усходняй Сібіры» аўтамабіляў БелАЗ. Паводле слоў пасла, паступаюць скаргі на тое, што «сэрвісная частка БелАЗа прадстаўлена вельмі слаба» ў згаданым рэгіёне. Пры гэтым попыт на велікагрузную тэхніку ва Усходняй Сібіры высокі і расійскі бок хацеў бы «ўтрымаць на рынку беларускія аўтамабілі».

Звяртаючыся да тэмы павышэння кошту газу для Беларусі з 2007 года, пасол паведаміў, што сёння «7 рэгіёнаў Расіі плацяць 100 долараў за газ. І ўсе новыя магутнасці, якія падключаюцца да газу, плацяць на парадак вышэй, чым Беларусь. Мы таксама знаходзімся на шляху да СГА. І мы будзем прыводзіць да прытомнасці сваю прамысловасць. Бо калі не зробім гэтага, то проста страцім яе».

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### «АНТЫКРЫЗІСНЫЯ» КАРУПЦЫЯНЕРЫ

**У Магілёве завяршыўся судовы працэс над антыкрызісным упраўляючым ААТ «Кожевник» Мялешкавым і галоўным інжынерам памянёнага прадпрыемства Калупаевым.**

Паводле звестак Генеральнай пракуратуры, спадар Мялешкаў замест таго, каб выводзіць акцыянернае таварыства з крызісу, вырашыў пажывіцца за яго кошт. У прыватнасці, упраўляючы спрабаваў прадаць індывідуальнаму прадпрымальніку вытворчыя памяшканні ААТ «Кожевник» па заніжанай больш чым у 4 разы цане. За гэтую паслугу спадар Мялешкаў запатрабаваў ад бізнэсмена 71 млн. рублёў. Адметна, што сам непасрэдна браць карупцыйныя грошы не адважыўся, і за першай «траншай» хабару ў памеры 17,5 тыс. долараў паслаў галоўнага інжынера прадпрыемства Калупаева, якога і затрымалі супрацоўнікі праваахоўных органаў. Суд прызнаў абодвух «антыкрызісных» карупцыянераў віноўнымі ў хабарніцтве. Спадар Мялешкаў атрымаў 8 гадоў і 6 месяцаў пазбаўлення волі, ягоны памагаты — 4 гады. Абодва будуць адбываць пакаранне ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### СТРАЛЯЮЦЬ У ДЗЯЎЧАТ... З ПНЕЎМАТЫЧНАЙ ЗБРОІ

**У Першамайскі РАУС Віцебска з Віцебскай абласной клінічнай бальніцы паведамілі, што брыгада «хуткай дапамогі» прывезла пасля выкліку з кватэры параненую віцяблянку.**

Як паведамілі «Звяздзе» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, было ўстаноўлена, што а першай гадзіне ночы ў дзяўчыну 1984-га года нараджэння на завулку Крупскай невядомы страляў з пнеўматычнай зброі. У выніку металічны шарык трапіў у нагу. Узбуджана крымінальная справа.

А літаральна праз дзень ужо ў Кастрычніцкі РАУС абласнога цэнтра па дапамогу звярнулася студэнтка — будучы медык. Як кажуць, сярод белага дня — прыкладна ў 15. 20 — у цэнтры горада невядомы стрэліў ёй ў спіну і пашкодзіў скураную куртку. Мяркуецца, што і ў гэтым выпадку стралялі з пнеўматычнай зброі. Добра, што цялесных пашкоджанняў яна не атрымала. Невядомага «снайпера» шукаюць. Як і ў першым выпадку, узбудзілі крымінальную справу па артыкулу «Асабліва злоснае хуліганства».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### НЕ ПЛАЦІШ ШТРАФ — АДДАЙ МАШЫНУ!

У Маскоўскай вобласці за нявыплату штрафу пры парушэнні ПДР судовыя приставы збіраюцца адбіраць у аўтаўладальнікаў мабільныя тэлефоны, аўтамагнітолы, калонкі, запасныя колы і аўтамабілі. Гэта можа адбыцца, калі штраф не будзе аплачаны вінаватым на працягу 30 дзён. Даўжніку даецца яшчэ 5 дзён для добраахвотнай выплаты. Калі ж у гаспадара аўтамабіля сродкі адсутнічаюць, арышт будзе накладзены на яго маёмасць.

## У прыроды замест надвор'я — суцэльныя рэкорды...

Калі б не некалькі халаднаватых дзён напрыканцы жніўня, якія прыйшлі на змену невыноснай трыццаціградуснай спякоце, то жнівень 2007 года цалкам мог бы стаць самым гарачым за ўсю гісторыю метэаралагічных назіранняў. Але ўсё ж яму давялося саступіць пальму першынства жніўню 1992 года. Тым не менш менавіта ў жніўні гэтага года быў пастаўлены абсалютны рэкорд, калі тэмпература паветра дасягнула на поўдні краіны 37 градусаў па Цэльсію. Увогуле сёлетні год аказаўся багатым на шматлікія рэкорды, — паведаміла на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэсцэнтры **начальнік аддзела клімату Рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра Алена КАМАРОЎСКАЯ.**

Сярэдняя тэмпература паветра трох летніх месяцаў склала плюс 18,4 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 1,6 градуса. Такім цёплым лета бывае ў Беларусі прыкладна адзін раз у 10 гадоў. Жнівень перавысіў кліматычную норму на 2,7 гарадуса, а найбольш выразныя адхіленні ад нормы назіраліся ў апошні летні месяц у цэнтральных рэгіёнах краіны і непасрэдна ў сталіцы, дзе тэмпература перавысіла кліматычную норму на 3,6 градуса.

Мэтэаролагі падлічылі, што за лета дзён з тэмпературай плюс 25 градусаў і вышэй набралася ад 30 да 55 (у залежнасці ад рэгіёна), а з тэмпературай вышэй за 30 градусаў — ад 3 да 14 (пры сярэдняй шматгадовай колькасці ад 1 да 6).

Рэдкая кліматычная з'ява назіралася 12 ліпеня ў Горках, дзе выпаў град, які дасягаў у дыяметры 43 міліметры, а асобныя яго «экзэмпляры» нават 50—60 міліметраў. «Град увогуле з'ява нячастая, якая носіць пераважна лакальны характар, а град, які дасягнуў такіх вялікіх памераў, — гэта ўнікальная з'ява, якая можа назірацца прыкладна адзін раз у паўстагоддзе», — патлумачыла Алена Камароўская.

Можна не сумнявацца, што, адпачыўшы ад спякоты, беларусы ўжо зноў засумавалі па цяплу і з нецярплівасцю чакаюць надыходу бабінага лета.

— Мушу вас расчараваць, але бабіна лета прыйдзецца пачакаць, — падзялілася бліжэйшымі прагнозамі **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра Вольга ФЯДОТАВА.** — У аўторак на тэрыторыю Беларусі пачалі паступаць паветраныя масы з еўрапейскай тэрыторыі Расіі, дзе сканцэнтравалася вельмі цёплае паветра. Таму на Гомельшчыне тэмпература паветра павысілася да 25 градусаў. Але ўжо ў пятніцу на тэрыторыю нашай краіны пачнуць паступаць больш халаднаватыя паветраныя масы са Скандынавіі. Пры не вельмі камфортным паўночным ветрыку тэмпература паветра панізіцца да 13—19 градусаў і толькі на поўдні краіны паветра яшчэ будзе прагравацца да 23 градусаў. У суботу, па нашых папярэдніх разліках, Беларусь будзе знаходзіцца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску, таму, спадзяёмся, што Свята горада ў Мінску не падмочыцца ападкамі. Тэмпература паветра па Беларусі будзе складаць ад 14 да 20 градусаў, а ў сталіцы — 16—18 градусаў. У нядзелю не выключаецца змяшчэнне на тэрыторыю Беларусі атмасфернага фронту з Балтыкі, які прынясе павелічэнне воблачнасці, паніжэнне тэмпературы і кароткачасовыя дажджы. У сталіцы ападкі, хутчэй за ўсё, пачнуцца ў другой палове дня, а тэмпература ў нядзелю ў Мінску будзе 14—16 градусаў.

У пачатку будучага тыдня тэмпературны фон будзе вагацца ў межах 11—17 градусаў. Увогуле ў другой дэкадзе верасня надвор'е чакаецца няўстойлівым. Па ўсёй тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Магчыма, бабіна лета завітае да беларусаў у другой палове верасня, але пакуль што сіноптыкі не бяруцца назваць яго дакладны тэрмін...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## АРАБСКІ ШЭЙХ ПАВЁЗ З БЕЛАРУСІ «СЕРАБРО» І МАЛАДУЮ ЖОНКУ

Член каралеўскай сям'і Аль Мактум, якая кіруе Дубаем, шэйх Саід бен Мактум Аль Мактум, 5 верасня пакінуў беларускую сталіцу і накіраваўся на Кіпр на этап Кубка свету па стэндавай стральбе. Невядома, ці ўдасца там заваяваць нейкія ўзнагароды, а вось з Мінска 30-гадовы Саід Аль Мактум звёз іх ажно дзве — спартыўную, «серабро» ў дысцыпліне скіт і асабістую, маладую жонку Наташу, азербайджанку па нацыянальнасці.

Як паставілася маладая жонка да таго, што ў шэйха ў Дубаі ўжо ёсць жонка і пяцёра дзяцей, прэсе даведацца не ўдалося.

Затое вядома, што шэйх высока ацаніў прыём, аказаны ў Беларусі, абстаноўку ўвогуле і спартыўныя аб'екты ў прыватнасці. У сакавіку наступнага года каманда ААЭ зноў мае намер наведаць нашу краіну для трэніровак, а ў перспектыве арабскі бок зацікаўлены ў стварэнні ў Беларусі пастаянна дзеючай трэніровачнай базы для сваіх спартсменаў. Гэтаксама Саід Аль Мактум вітаў рашэнне Генеральнай асамблеі міжнароднага стралковага саюза правесці ў Мінску ў 2008 годзе фінал Кубка свету.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАДА 6-ГА СКЛІКАННЯ ПАЧНЕ ПРАЦЭДУРУ ІМПІЧМЕНТУ ЮШЧАНКУ?

**Старшыня Вярхоўнай Рады 5-га склікання Аляксандр Мароз не выключае, што наступны склад парламента пачне супраць прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі працэдуру імпічменту.**

Паводле яго слоў, калі адна галіна ўлады імкнецца ўзяць на сябе функцыі другой, то гэта па юрыдычных вызначэннях з'яўляецца ўзурпацыяй улады, за што прадугледжана адказнасць, у тым ліку крымінальная. Мароз адзначыў, што ў адносінах да прэзідэнта Канстытуцыяй вызначаны парадак выказвання яму недаверу ў выглядзе імпічменту. «І, відавочна, новы парламент, калі выбары сапраўды адбудуцца і паўнамоцтвы парламента будуць прызнаныя, займаецца гэтым пытаннем, таму што без пакарання пакідаць тое, што робіцца сёння ва Украіне, нельга», — сказаў ён.

### СУСВЕТНЫМ ЛІДАРАМ ПА ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ ПРЫЗНАНА НАРВЕГІЯ

**Часопіс The Economist надрукаваў чарговы штогадовы рэйтынг краін па якасці жыцця.**



Лідарам дваццаткі стала Нарвегія, за ёй ідуць Ісландыя і Аўстралія. Замыкае спіс Новая Зеландыя. Рэйтынг заснаваны на індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу, распрацаванага ААН, які разлічваецца па трох асноўных паказчыках: чакаемая працягласць жыцця пры нараджэнні, узровень адукацыі насельніцтва і ўзровень рэальных даходаў насельніцтва.

### У ШВЕЦЫІ ЗАТРЫМАЛІ П'ЯНАГА ЎКРАІНСКАГА ПІЛОТА

**Украінскага пілота, які знаходзіўся пад уздзеяннем алкаголю, затрымалі ў сераду ў стакгольмскім аэрапорце Арланда. Затрыманы з'яўляўся галоўным пілотам украінскага экіпажу чартарнага рэйса Міжнародных Украінскіх Авіяліній.**

Шведы абвінавачваюць украінца ў грубым парушэнні правілаў паветраных перавозак. Калі пілота прызнаюць вінаватым, яму пагражае страта лётнага сертыфікату. У сувязі з інцыдэнтам самалёт быў затрыманы на 6 гадзін, а пілота замянілі на шведскага. На борце чартарнага рэйса, які павінен быў следаваць на Канарскія астравы, знаходзілася 157 чалавек. Адзначым, што гэта не першы інцыдэнт са спажываннем алкаголю ўкраінскімі пілотамі за мяжой — у пачатку года ў Нарвегіі камандзір экіпажа ўкраінскага Ан-22 быў асуджаны на 5 месяцаў турмы; 8 студзеня нарвежская паліцыя затрымала семярых грамадзян Украіны — членаў экіпажа Ан-22, якія збіраліся вылецець у нецвярозым стане.

### ДА 2030 ГОДА АРКТЫКА ЗАСТАНЕЦЦА БЕЗ ІЛЬДОЎ

**Гэтым летам арктычныя льды таялі ў беспрэцэдэнтным тэмпе, і цяпер плошча акіянскіх лядовых палёў у рэгіёне зменшылася да рэкорднага ўзроўню, адзначае The Guardian. Спецыялісты літаральна ўзрушаны таяннем ільдоў: толькі за мінулы тыдзень знікла частка лядовага покрыва, якая па плошчы ўдвая перавышае Вялікабрытанію.**



Таянне было настолькі інтэнсіўным, што паўночна-заходні праход уздоўж паўночнага ўзбярэжжа Канады цяпер поўнасцю судаходны. Да канца верасня можа ачысціцца ад ільду і паўночна-ўсходні праход уздоўж расійскага ўзбярэжжа Паўночнага Ледавітага акіяна. Калі знікненне льдоў будзе працягвацца такімі ж тэмпамі, то да 2030 года летам у Арктыцы зусім не застанецца льдоў. Паведамленне вучоных, безумоўна, падагрэе цікавасць палітыкаў да Арктыкі. Ужо зараз некалькі краін змагаюцца за права на асваенне радовішчаў нафты і газу, якія, як лічыцца, залягаюць пад дном акіяна.

### КАЗЛОЎ ЗАБІЛІ — «БОІНГ» ПАЛЯЦІЦЬ!

**Прадстаўнікі дзяржаўнай авіякампаніі Непала прынеслі ў ахвяру двух казлоў, каб забяспечыць бесперабойную работу аднаго са сваіх двух самалётаў «Боінг-757», паведамляюць інфармагенцтвы.**



Абрад ахвярапрынашэння індуісцкаму богу неба быў праведзены перад няспраўным самалётам у адзіным міжнародным аэрапорце краіны. Некалькі тыдняў таму ў лайнеры знайшлі тэхнічную непаладку, з-за чаго частка рэйсаў авіякампаніі была адменена. Непальскія «Боінгі» выконваюць міжнародныя палёты ў некалькі азіяцкіх сталіц. Паводле слоў прадстаўніка авіяцыйных уладаў Непала, пасля ахвярапрынашэння паломку паспяхова ўстаранілі, і самалёт зноў можа падымацца ў паветра. Чыноўнік не стаў удакладняць характар няспраўнасці. Таксама не зразумела, ці быў «Боінг» адрамантаваны дзякуючы ўмяшанню бажаства або намаганнямі тэхнічных службаў.

Кватэрнае пытанне

# Калі тэлефон адключаны

**У ЖЭСе прачытаў інфармацыю аб парадку пераразліку платы за жыллёва-камунальныя паслугі (ацяпленне, водазабеспячэнне, каналізацыю і інш.) пры часовай адсутнасці па ўважлівых прычынах грамадзян, якія пражываюць у шматкватэрных дамах. А як у такіх выпадках рэгулююцца пытанні аплаты за радыёкропку і тэлефон?**

**Л.Н.** *Брэст*

У адпаведнасці з падпунктам 2.22 Правілаў аказання паслуг мясцовымі тэлефоннымі сеткамі (зацверджаны загадам Мінсувязі ад 19 чэрвеня 1995 года № 66) па просьбе абанента дапускаецца часовае выключэнне тэлефона на тэрмін, указаны ім у заяве. У гэтым выпадку за абанентам захоўваецца нумар тэлефона і бярэцца абанентная плата за час захоўвання абанемента. Плата за падключэнне тэлефона зноў не спаганяецца.

Згодна з Правіламі аказання паслуг радыёфікацыі (зацверджаны пастановай Мінсувязі ад 6 верасня 2002 года № 19), паводле заявы абанентаў-спажыўцоў робіцца адключэнне радыёкропкі ад сеткі праводнага вяшчання і плата за паслугі праводнага вяшчання не спаганяецца. За падключэнне радыёкропкі зноў у радыётрансляцыйную сетку праводзіцца плата ў адпаведнасці з тарыфамі на паслугі радыёфікацыі для насельніцтва.

# Агульны «стаж»? Не падстава

**Мой муж з 1969 года працуе на адным са сталічных прадпрыемстваў. З 1974-га стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Летась нам, як быццам, ужо прапанавалі будавацца, але потым агледзеліся, што ў 1998 г. сын выпісваўся з кватэры і ў нас амаль год «хапала метраў». Гэта значыць, не было падстаў знаходзіцца на ўліку. Але ж і без гэтага года «стаж» чакання ў нас вельмі вялікі. Дык ці правільна нам адмовілі?**

**Р. Б.**, *г. Мінск.*

Паляпшэнне жыллёвых умоў ажыццяўляецца ў парадку чарговасці, зыходзячы з часу пастаноўкі на ўлік. Гэта правіла прымяняецца як па месцы працы, так і па месцы жыхарства. Яно ж дзейнічае і пры прадастаўленні дзяржпадтрымкі (ільготнае крэдытаванне, пазыкі, субсідыі). У дадзеным выпадку, верагодна, на прадпрыемстве ёсць работнікі, якія былі прыняты на кватэрны ўлік раней сям'і заяўніка і пакуль яшчэ не палепшылі жыллёвыя ўмовы.

Што датычыцца пераносу чаргі, то пры выпісцы сына ўзровень забяспечанасці жыллём у займаемай кватэры павысіўся і адпаведна зніклі падставы для знаходжання сям'і на кватэрным уліку.

У пісьме, аднак, не паведамляецца, па якой прычыне сын выпісваўся з кватэры. У асобных выпадках за грамадзянамі, якія адсутнічаюць, захоўваюцца жыллёвыя правы. У тым ліку і права на знаходжанне на кватэрным уліку (прызыў на тэрміновую ваенную службу, накіраванне арганізацыяй на вучобу, звальненне ў сувязі са скарачэннем колькасці альбо штату працаўнікоў і ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам і калектыўным дагаворам).

**Віктар САВІЦКІ.**

# Летась беларусы набылі 160 тыс. камп'ютараў

## У Беларусі імклівымі тэмпамі развіваецца рынак інфармацыйных тэхналогій

**Паводле звестак прадстаўніцтва карпарацыі «Microsoft» у Беларусі і Украіне, летась беларусы набылі амаль 160 тыс. персанальных камп'ютараў.**

Дынаміка росту гэтага сегменту рынку ў нашай краіне складае каля 25—30 працэнтаў у год, што з'яўляецца адным з лепшых паказчыкаў не толькі ў СНД, але і ва ўсёй Усходняй Еўропе. Не дзіўна, што беларускі рынак высокіх тэхналогій вабіць да сябе буйнейшага ў свеце вытворцу праграмнага забеспячэння — карпарацыю «Microsoft». Сусветнавядомая фірма, якая працуе на нашым рынку толькі са студзеня 2005 года, сёлета істотна ўмацавала свае пазіцыі ў Беларусі. За 2007 фінансавы год агульны аб'ём бізнэсу «Microsoft» у нашай краіне павялічыўся на 218 працэнтаў. Аснову бізнэсу «Microsoft» у Беларусі складае продаж праграмнага забеспячэння. Адметна, што карпарацыі ўдалося дасягнуць значных поспехаў, нягледзячы на дамінаванне «пірацкай прадукцыі» на айчынным рынку. Па некаторых падліках, доля кантрафакту ў гэтым сегменце беларускага рынку дасягае 90 працэнтаў. Тым не менш, прадстаўнікоў карпарацыі «піраты» не бянтэжаць. На думку генеральнага дырэктара «Microsoft» у Беларусі і Украіне Валерыя Ланавенкі, «паспяховая барацьба з парушэннямі правоў інтэлектуальнай уласнасці — усяго толькі пытанне развіцця ў Беларусі адпаведнага заканадаўства і інфраструктуры».

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

Ну і ну!

# За прэзерватыў — $2 млн?

**Жыхар Масквы падаў у суд іск на суму 50 млн расійскіх рублёў (каля $2 млн) супраць аднаго з расійскіх піўзаводаў. У такую суму істец ацаніў маральны ўрон, які ён панёс, знайшоўшы ў закаркаванай бутэльцы піва прэзерватыў і ўпакоўку ад яго.**

Пацярпелы набыў у магазіне цэлую скрыню піва, таму адразу не ўбачыў староннія прадметы. Экспертыза ўстанавіла, што яны трапілі ў бутэльку менавіта на прадпрыемстве — вытворцы напою.

Такую буйную суму іскавых патрабаванняў адвакат істца тлумачыць тым, што пацярпелы атрымаў цяжкую маральную траўму і ў цяперашні час не можа ўжываць напоі заводскай вытворчасці з-за боязі знайсці ў іх староннія прадметы і атруціцца. Ён вымушаны быў звярнуцца па дапамогу да псіхолага і цяпер праходзіць курс псіхатэрапіі. Акрамя таго, як лічыць абарона пацярпелага, гэта судовая справа павінна стаць прэцэдэнтам, паколькі ў цяперашні час спажывец у Расіі практычна бяспраўны перад «бязмежжам вытворцаў харчовых тавараў».

**Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.**

# «ДАБРО» ДАБРО ПРЫНОСІЦЬ ЛЮДЗЯМ

Выпрабавана на сабе

Загаловак, відаць, трэба патлумачыць. У нас, на захадзе Віцебшчыны, спакон веку дабром называлі збожжа. І назва гэта поўнасцю апраўданая. Для селяніна збожжа — жыта ці пшаніца, ячмень ці авёс — заўсёды прыносіць дабро ў хату. Стагоддзямі наяўнасць патрэбнай колькасці дабра на зіму, да новага ўраджаю азначала, што сям'я не будзе галадаць, не пойдзе з торбаю па людзях. Хлеб ды бульба былі асноўным харчаваннем вяскоўца яшчэ і ў першай палове XX стагоддзя. Помніце, герой аднаго верша Максіма Танка завітаў зімовым вечарам пераначаваць у вясковую хату. А гаспадар распавядае яму, што хлеб у іх на стол кладзецца толькі для гасцей. А потым горка ўздыхае:

*«Добра, калі хопіць бульбы*
*ў нашай хаце*
*Да вясны, да першых,*
*з выраю буслоў.»*

Сёння, зразумела, не толькі хлебам і бульбай жыве селянін. Але ж і не толькі па традыцыі адносіны да дабра, збожжа ў большасці беларусаў асабліва трапяткія. Кожны год дзяржава вельмі вялікую ўвагу надае вырошчванню і ўборцы збожжавых культур. Дастойны ўраджай — аснова харчовай бяспекі краіны.

Сёлета і на маёй роднай Віцебшчыне вырашчаны і сабраны добры ўраджай дабра. Прадаецца яно дзяржаве, застаецца ў сельгаскааператывах для жывёлы.

Але хачу павесці гаворку аб тым збожжы, дабры, якое ў гэтым годзе апынулася ў засеках вяскоўцаў, у іх прыватных гаспадарках. Тым больш што і сам меў нейкае дачыненне да хлебаробскай справы. Ёсць і канкрэтныя назіранні.

Сёлета пад маім апекаваннем (не па праву валодання, а з прычыны неабходнай дапамогі блізкаму чалавеку) быў ладны кавалак зямлі ля вёскі Хацілы. У гаспадыні там бацькоўскі дом, сад і каля трыццаці сотак. Не хочацца ёй зусім забывацца на Бацькаўшчыну. Вось і ўрабляецца зямля. Восенню вырашыў пасеяць там трыцікале. Вырасла неблагое. І вось жнівень — самая пара малацьбы. У мясцовым сельскім вытворчым кааператыве «Хацілы» заплаціў за прадастаўленне камбайна 50 тысяч рублёў. Трэба было чакаць, калі тэхніка выслабаніцца. І тут не ў першы ўжо раз аддаў даніну мабільнаму тэлефону. Пазваніў камбайнер з калгаса: «Заканчваю рамонт. У дзве гадзіны буду на вашым участку». А потым яшчэ адзін званок: «Паспяшайцеся. Я ўжо да вас еду». Да Хаціл некалькі кіламетраў, так што паспелі на машыне своечасова. Камбайнер пачаў абмалот, мы ж рыхтавалі мяхі, вялікую посцілку, куды будзе высыпацца збожжа. Але на палове ўчастка камбайн зламаўся. Той, хто вырошчвае зерне, зразумее роспач: надвор'е ўжо пачынае псавацца. А тут такая затрымка. Ды толькі камбайнер пазваніў па «мабільніку» — і літаральна праз паўгадзіны на наш участак прыйшло другое «Палессе», а потым і трактар, які пацягнуў няспраўную машыну ў майстэрні.

Хутка змалацілі, выгрузілі на посцілку ўраджай. Карэннаму гараджаніну цяжка зразумець, што адчуваеш у той момант, калі з камбайна моцным струменем высыпаецца збожжа. Хоць і працуе рухавік машыны, усё роўна чуваць, як яно шалясціць, спачатку стукае па посцілцы, а потым толькі шуміць, рассыпаючыся па ёй...

Камбайн пайшоў на іншыя ўчасткі, сабралі зерне ў мяхі, за тры рэйсы на легкавіку перавезлі дадому. Цяпер крыху дасушыць на асфальтаваным дварышчы, пераверяць — і гатова. Трэба сказаць, што ў гаспадыні быў яшчэ ўчастак, дзе вясной я сеяў ячмень. Змалацілі і яго таксама. Але калі ўзяць у рукі аловак і падлічыць выдаткі, то зерне на такіх невялікіх участках вырошчваць нявыгадна. Ды толькі цягне людзей да зямлі. Адна справа — купіць на кірмашы. Іншая — прывезці са свайго поля. Хаця б і тым жа курам, калі іншай гаспадаркі не трымаеш.

Увогуле ж вяскоўцам займацца вырошчваннем зерневых прасцей, чым гараджанам, якія яшчэ маюць на вёсцы кавалкі зямлі. Па-першае, участкі ў іх вялікія, так што намалот немалы. Гаварыць пра вялікія прыбыткі не даводзіцца, але ў многіх хапае не толькі на жывёлу: нешта здаецца ў калектыўную гаспадарку, адвозіцца на кірмаш.

Што такое — вырасціць, скажам, азімую збажыну? Восенню можна і канём узараць кавалак зямлі, з сявенькай прайсціся па ім, рассыпаць збожжа. (Ганаруся, што гэту работу засвоіў няблага. І калі іду не з сявенькай, а са звычайным вядром на повязі па чорнай, пераараной і забаранаванай зямлі, рассяваю зерне, заўсёды ўспамінаю нашага класіка Караткевіча. У нейкім з яго раманаў было: «Выйшлі сейбіты на нівы свае».) Пасеяў, забаранаваў — а цяпер чакай найперш дажджу, а зімою снегу. Калі ёсць магчымасць, зрабі хім-праполку, падсей угнаенні. Ведаю, што ёсць ужо аматары вырошчвання збажыны без аніякай хіміі. Гэта — багатыя людзі, яны потым наймаюць работнікаў для жніва сярпамі ці косамі, абмалоту збажыны, мелива і выпечкі хлеба самага натуральнага, нават на кляновых лісцях.

Але ўсё-такі нават на маленькіх участках абмалот вядзецца камбайнамі. Шмат было раней праблем для калгаснікаў з гэтым. Ды толькі і тут прыходзіць новае. У некалі славутым... Чаму некалі? І сёння вядомым на ўсю краіну сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Навасёлкі-Лучай» Пастаўскага раёна вясковец вясною падае заяву аб тым, якую плошчу зерня ён хацеў бы вырасціць (зразумела, да гектара). Сельгаскааператыў бярэ на сябе гэту турботу — ад падрыхтоўкі насення да пасеву, догляду, уборкі, потым сушкі зерня, яго ачысткі. Можа нават змалоць зерне на корм жывёле. І абыходзіцца гэта вяскоўцу ўдвая таней, чым бы ён займаўся справай сам. Канешне, такі клопат сельгаспрадпрыемству абыходзіцца ў капейчыну. Але ж затое людзі ў ім працуюць у самую гарачую пару без аніякіх турбот пра сваё дабро, сваё збожжа. Вось яно — чыстае, дагледжанае, ляжыць на калгасным таку. Колькі трэба — забірай.

Ёсць шмат іншых прыкладаў падобнага падыходу да вырашэння зерневых спраў на вёсцы.

Але ў некаторых вёсках яшчэ дужыя мужчыны косяць свае збожжавыя палеткі, складаюць іх у стагі ў чаканні, калі прыйдзе камбайн для абмалоту. У прынцыпе праблема абыходжання з вырашчаным дабром вырашальная. Нават несельгаспадарчыя прадпрыемствы сёння маюць свае камбайны. І гектар добра паспелай, ураджайнай збажыны для вяскоўца і нават гараджаніна абавязкова павінен стаць дабром, надзеяй на добрую будучыню.

**Алесь КАСЦЕНЬ.**

*Віцебская вобласць.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ніна КАЛПАКОВА** з дачкой **Алінай** збіраюць абмалочанае зерне на прысядзібным участку.

*в. Бярозаўка, Слаўгарадскі раён.*

Розгалас

## НОВЫ ЗАГС У МСЦІСЛАВЕ

**У Мсціславе адкрылі новае памяшканне для аддзела ЗАГС. Раней жыхары райцэнтра рэгістравалі шлюбы і разводы, нараджэнні і смерці ў прыстасаваных пакоях Дома культуры.**

Цяпер ЗАГС атрымаў новае памяшканне ў будынку райвыканкама. На яго рэканструкцыю было выдаткавана больш за 60 млн рублёў, і аддзелачныя работы яшчэ працягваюцца. У светлых і прасторных пакоях паставілі сучасную офісную мэблю і камп'ютарную тэхніку.

У дзень адкрыцця новага ЗАГСа першую пару, якая брала шлюб, павіншавалі прадстаўнікі райвыканкама і ўручылі маладым падарунак. Пасля ўрачыстай цырымоніі яны адправіліся ўскласці кветкі да помніка Пятру Мсціслаўцу — добра, што ЗАГС цяпер месціцца насупраць скульптуры вядомага асветніка, а таксама да Алеі герояў. Такая цяпер новая прыгожая традыцыя маладых мсціслаўцаў.

**Ілона ІВАНОВА.**

## БАНКІ ПАМЯНЯЛІ ЛІЦЭНЗІІ

**Яшчэ дзвюм фінансавым установам — ЗАТ «Дэльта Банк» і ААТ «Міжнародны рэзервовы банк» — заменены раней выдадзеныя дазволы (ліцэнзіі) на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці.**

Як падкрэсліў у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» прэс-сакратар Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, адпаведная пастанова прынята ў сувязі з тым, што банкі давялі статутны фонд да 5 млн еўра. Разам з тым, уласны капітал гэтых банкаў пакуль не адпавядае ўстаноўленаму нарматыву, гэта значыць эквіваленту не менш 10 млн еўра. А таму банкам да 1 ліпеня наступнага года прыпынена дзейнасць выдадзенай ліцэнзіі на прыцягненне грашовых сродкаў насельніцтва ва ўклады (дэпазіты), а таксама на адкрыццё і вядзенне банкаўскіх рахункаў фізічных асобаў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПЕРАПІСВАЕМ ТЭЛЕФОННУЮ КНІЖКУ...

**5 верасня ў сталіцы распачынаецца пераключэнне тэлефонных абанентаў з нумарацыяй 238-00-00—238-09-99 на новую электронную АТС з заменай нумарацыі на 385-00-00—385-09-99.**

Усе гэтыя абаненты пасля перападключэння на электронную АТС атрымаюць доступ да дадатковых сэрвісных відаў абслугоўвання. А 17 верасня ў Мінску распачнецца пераключэнне абанентаў з нумарацыяй 279-30-00—279-39-99 на новую электронную АТС з заменай нумарацыі на 376-00-00—376-09-99. Пасля завяршэння падключэння на старыя тэлефонныя нумары будзе ўстаноўлены аўтаінфарматар, які паведаміць пра новы парадак набору нумара.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПРЫ ЗАТРЫМАННІ СУПРАЦІЎЛЯЛІСЯ ДЗЯРЖІНСПЕКТАРАМ

**Супрацоўнікамі Любанскай міжрайінспекцыі за крадзеж рыбы на сажалках ААТ «Рыбакамбінат «Любань» былі затрыманы два грамадзяніны. Канфіскаваная рыба агульнай вагой 55 кілаграмаў на суму больш за 10 базавых велічынь (313,5 тыс. рублёў) здадзена на склад рыбгаса.**

Пры затрыманні парушальнікі аказалі непадпарадкаванне і фізічнае супраціўленне дзяржінспектарам. На месца здарэння была выклікана следча-аператыўная група Любанскага РАУС. Матэрыялы ў адносінах да гэтых асобаў перададзены ў пракуратуру Любанскага раёна.

А работнікамі Мікашэвіцкай міжрайінспекцыі на возеры Белае Жыткавіцкага раёна за незаконнае паляванне (без паляўнічай пуцёўкі) быў затрыманы грамадзянін 1977 года нараджэння, індывідуальны прадпрымальнік. За парушэнне Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання на яго складзены адміністратыўны пратакол, канфіскаванае ружжо перададзена ў Жыткавіцкі РАУС. Пры затрыманні грамадзянін, знаходзячыся ў нецвярозым стане, аказаў непадпарадкаванне і фізічнае супраціўленне дзяржінспектарам, за што быў прыцягнуты судом Жыткавіцкага раёна да адміністратыўнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры трох базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У МАСКВЕ З'ЯВІЎСЯ ГОМЕЛЬСКІ МАГАЗІН

**Называецца ён «Сябры», і яго адкрыццё было прымеркавана да святкавання 860-годдзя сталіцы Расійскай Федэрацыі, у якім прынялі ўдзел таксама старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Якабсон і яго намеснік Баляслаў Пірштук.**

Магазін — прадуктовы, і гандаль у ім беларускімі таварамі ішоў вельмі бойка, бо масквічы добра знаёмыя з іх высокай якасцю.

Дарэчы, з гэтай акругай у гамяльчан усталяваліся добрыя сувязі яшчэ некалькі гадоў назад, якія пастаянна развіваюцца. Па прапанове прэфекта ўказанай акругі Аляксея Чэлышава яны могуць узяць у арэнду тут гандлёвыя плошчы. Масквічам спадабаўся ў горадзе на Сожы Палац гульнявых відаў спорту — такі ж яны будуць узводзіць у сябе па праекту гамяльчан і з прымяненнем гомельскіх клееных драўляных канструкцый.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

ОАО «УНИВЕРСАМ «ЗАСЛАВЛЬ»
*СООБЩАЕТ, ЧТО*

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**состоится 17 сентября 2007 г. в 13 часов по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 49.**

*Повестка дня:*

1. О досрочном прекращении полномочий членов Совета директоров и ревизора Общества.
2. Выборы членов Совета директоров и ревизора Общества.
3. Об аннулировании акций ОАО «Универсам «Заславль», выкупленных на баланс Общества.
4. Об изменении размера Уставного фонда ОАО «Универсам «Заславль».
5. О внесении и утверждении изменений и дополнений в Устав ОАО «Универсам «Заславль».
6. О совершении сделок Общества.

**Телефон для справок 226-61-90.**

Гульня № 1

# Капітану зборнай знайшлі замену

## Замест Аляксандра Глеба ў дабрачыннай акцыі перад матчам з румынамі ўзяў удзел Павел Пласконны

**У Мінск чартэрным рэйсам прылятае нацыянальная зборная Румыніі па футболу. У Дзень горада, 8 верасня, жыхары і госці Мінска могуць пабачыць гульню лідара адборачнай групы і падтрымаць беларусаў у адказнай сустрэчы на сталічным «Дынама».**

Каго ж мы пабачым на полі мінскага «Дынама» 8 верасня? Лягчэй сказаць, хто дакладна аказаўся па-за гульнёй. Гэта ігракі томскай «Тамі» Аляксандр Кульчы і Віталь Булыга, якія адмовіліся ад прапановы Бернда Штанге прыехаць на таварыскі матч з Ізраілем з-за занятасці ў клубе. Нападаючага італьянскай «Пізы» Віталя Кутузава вырашылі не непакоіць у сувязі з яго бацькоўствам. А вось чаму не выкліканы ў зборную галкіпер «Масквы» Юрый Жаўноў, які ўжо аднавіўся пасля траўмы, пакуль застаецца загадкай. Хутчэй за ўсё адказ на яе дасць сёння сам галоўны трэнер на прэс-канферэнцыі ў Доме футболу. Магчыма, Штанге палічыў, што лепей аддаць перавагу тым варатарам, каго ён праверыў у матчы з ізраільцянамі, калі беларусы святкавалі перамогу (тады Жаўноў адсутнічаў з-за траўмы). Аднак, каго настаўнік паставіць у вароты на гэты раз, адразу вызначыць цяжка: Васіль Хамутоўскі трапіў у няміласць клубнага кіраўніцтва, бо замест таго, каб рыхтавацца да адказнага матча «Тамі» (каманда знаходзілася ў аўтсайдэрах прэм'ер-лігі), адправіўся на таварыскі матч зборнай, а галкіпер «Масквы» Антон Амельчанка правёў толькі адзін матч у варотах зборнай. Расцэнім іх шанцы, як 50 на 50.



Фота БЕЛТА.

*Бернд ШТАНГЕ і адзін з варатароў зборнай Уладзімір ГАЕЎ у час адкрытай трэніроўкі.*

Калі ў варатарскім пытанні ўзнікае дылема, то ў абаронцаў наогул складаная сітуацыя. Штанге можа спадзявацца на Арцёма Радзькова, Паўла Пласконнага, Яна Цігарава, а вось Сяргей Амельянчук яшчэ аднаўляецца пасля траўмы. Нагадаю, што замест абаронцы «Растова» быў выкліканы ігрок мінскага МТЗ-РІПО Ігар Мальцаў. Акрамя яго дэбютаваць у зборнай можа Ягор Філіпенка з барысаўскага БАТЭ.

Ці пойдзе Штанге на сваеасаблівую авантуру і праверыць на справе навічкоў у адборачным матчы? Улічваючы, што беларуская зборная зараз знаходзіцца на пятым месцы ў групе з 7 ачкамі і ўжо наўрад ці можа прэтэндаваць на выход на Еўра-2008, такі варыянт магчымы. Праўда, таго ж Мальцава Штанге можа вярнуць у «маладзёжку», якая мае шанц гуляць на чэмпіянаце Еўропы-2009. Менш хваляванняў выклікае наша паўабарона, дзе дамінуюць вопытныя Уладзімір Карыцька, Цімафей Калачоў, Дзяніс Коўба, Максім Рамашчанка, Аляксандр Глеб. Праўда, капітан зараз падхапіў ангіну. Па гэтай прычыне днямі паўабаронцу лонданскага «Арсенала» знайшлі замену... Не палохайцеся: не на полі (на яго Глеб выйдзе), а каб наведаць дзіцячы анкалагічны цэнтр у Бараўлянах. Замест Глеба ў дабрачыннай акцыі асацыяцыі БФФ узяў удзел Павел Пласконны. Акрамя абаронцы салігорскага «Шахцёра», з дзецьмі сустрэліся галоўны трэнер зборнай Бернд Штанге, намеснік старшыні асацыяцыі БФФ Міхаіл Вяргеенка і галкіпер «Тамі» Васіль Хамутоўскі.

Што ж датычыцца форвардаў, то ў распараджэнні Штанге лепшы бамбардзір нацыянальнага чэмпіянату Раман Васілюк з «Гомеля», Сяргей Карніленка з днепрапятроўскага «Дняпра», Генадзь Блізнюк і Віталь Радзівонаў з барысаўскага БАТЭ, лідара першынства краіны і прадстаўніка Беларусі ў Кубку УЕФА. А вось нападаючага брэсцкага «Дынама» Дзмітрыя Мазалеўскага ў матчы з румынамі мы наўрад ці пабачым. Хоць нямецкі спецыяліст і абяцаў пасля таварыскай сустрэчы з ізраільцянамі, дзе выпусціў дынамаўца ў абарону, абавязкова праверыць Мазалеўскага ў атацы. Справа ў тым, што форвард траўмаваў ікраножную мышцу. Адзінае, у чым нельга сумнявацца, — пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера з Германіі ў беларусаў адкрылася другое дыханне (гэта было бачна яшчэ на дэбютным для Штанге таварыскім матчы з Ізраілем), і нашы зноў парадуюць сваім жаданнем змагацца ў кожным гульнявым моманце да фінальнага свістка.

— Прыход новага трэнера стаў знакавай падзеяй, — заявіў днямі старшыня БФФ Генадзь Нявыглас у час гутаркі з навучэнцамі Мінскага дзяржаўнага Палаца дзяцей і моладзі. — Новы настаўнік уносіць у падрыхтоўку нашай каманды еўрапейскія методыкі гульні. Аднак шмат будзе залежаць і ад саміх ігракоў.

**Ірына ПРЫМАК.**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» ПРОВОДИТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ НА ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ 26 СЕНТЯБРЯ 2007 г.**

| № п/п | Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв. м) | Начальная цена продажи объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Площадь отчуждаемого участка (га) | Форма проведения торгов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1. | Здание гаража (инв. № 91), здание склада (инв. № 92), здание склада ГСМ (инв. № 93), здание конторы (инв. № 94), здание заправки ГСМ (инв. № 96), кабельные линии электропередач ААБ-13х120, инв. № 108, асфальтобетонное покрытие (инв. № 109), цементобетонное покрытие (инв. № 110), ограждение из колючей проволоки (инв. № 111), ворота металлические (инв. № 112), в/г № 78, г. Витебск, ул. 1-я Заречная, 2Б; 795,4 м². | 154 000 000 | 15 400 000 | 1,1886 | Открытый аукцион |
| 2. | Здание аэродромной службы (административное) (инв. № 92/57), в/г № 92 «Мачулищи», Минский район; 329,9 м² | 186 000 000 | 18 600 000 | 0,0441 | Открытый аукцион |
| 3. | Здание мастерской с тамбуром (инв. № 14/623), в/г № 14 «Печи», г. Борисов, ул. Братьев Вайнрубов, 100; 4887,7 м² | 315 000 000 | 31 500 000 | 1,2564 | Открытый аукцион |
| 4. | Здание контрольно-технического пункта, в т.ч. мастерские (инв. № 5/306) с асфальтовым мощением (инв. № 306), в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск, 2 этажа; 177,0 м². | 74 000 000 | 7 400 000 | 0,0386 | Открытый аукцион |
| 5. | Здание неотапливаемого гаража (инв. № 5/305) с асфальтовым мощением (инв. № 305), в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск; 1196,0 м². | 142 000 000 | 14 200 000 | 0,2692 | Открытый аукцион |
| 6. | Здание овощехранилища с крыльцами (инв. № 65/7) с ограждением из колючей проволоки — 21,6 м (инв. № Д, в/г № 65 «Солнечный», г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 91а; 51,0 м². | 6 500 000 | 650 000 | 0,05 | Открытый аукцион с условиями* |
| 7. | Здание штаба с крыльцом (инв. № 65/4), здание уборной (инв. № 65/4а), ограждение дощатое (инв. № Ф) — 45 м, ограждение глухие ж/б панели (инв. № Х) — 348 м, ограждение кирпичное (инв. № Ш) — 6,52 м, ворота метал. (инв. № Щ) — 9 м², в/г № 65 «Солнечный», г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 91а; 233 м² | 108 700 000 | 10 870 000 | 0,4 | Открытый аукцион с условиями* |
| 8. | Здание поликлиники (инв. № 1/39) с асфальтовым мощением (инв. № 39) — 42 м², внутридворовой водопроводной сетью (инв. № В3) — 73,6 м, квартальными канализационными сетями (инв. №№ К1, К2) 153,85 м, кабельными линиями 0,4 кВ (инв. №№ КЛ1, КЛ2) — 143,9 м, г. Бобруйск, в/г № 1 «Крепость»; 652,0 м² | 150 000 000 | 15 000 000 | 0,2368 | Открытый аукцион с условиями** |

* Профиль использования объекта (п. 6, п. 7): производственная база, склад, размещение производства при условии согласования с заинтересованными службами (санитарно-эпидемиологической, пожарной, экологической и т.д.).

** Условие реализации объекта (п. 8): не позднее чем в месячный срок с момента совершения сделки. Новый собственник обязан подписать и зарегистрировать охранное обязательство здания, а также осуществлять права собственника в отношении указанного объекта в соответствии с законодательством об охране историко-культурного наследия.

**Тип помещения:** отдельно стоящие. **Форма проводимого аукциона:** без условий (кроме п. 6, п. 7, п. 8). Здания в аренде не находятся. Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

*Аукцион состоится в 11 часов 30 минут 26 сентября 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы».*

***Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 24 сентября 2007 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 618, РУП «Белспецконтракт».***

**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи в день проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости объекта платежами в течение 20 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

*По ранее проведенным торгам извещения публиковались в газетах: «Звязда» 7 октября, 13 октября, 18 ноября, 5 декабря 2006 г., 28 февраля, 7 июня, 10 июля, 27 июля, 10 августа 2007 г., «Народное слово» 10 июля 2007 г., «Коммерческий курьер» 11 июля 2007 г., «Единство» 18 июля 2007 г.*

**Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05. Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com; e-mail: info@belspeckontrakt.com**

# Лепшых паштальёнаў і сувязістаў вызначылі ў Брэсце

**Дзявяты абласны конкурс сярод паштальёнаў і аператараў паштовай сувязі прайшоў ў Брэсце. На спаборніцтвы сабраліся каманды-пераможцы раённых аглядаў.**

У гэтым годзе была новая форма «хатняга задання»: канкурсанты рыхтавалі электронную прэзентацыю з прапановамі па поўнай аўтаматызацыі ўсіх вытворчых працэсаў вузла сувязі. Лепшымі сярод паштальёнаў сталі Тамара Грыгор'ева з першага аддзялення сувязі Брэста і Наталля Ботух з другога аддзялення, а таксама Алена Верас з Вулькі-2 Лунінецкага раёна і Галіна Сахарчук са Старога Сяла Жабінкаўскага раёна.

Пераможцамі сярод аператараў паштовай сувязі выйшлі Валянціна Сечык з Баранавіч, Таццяна Скарабагатая і Вольга Селіванюк з Брэста.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Спорт-тайм

## ДВОЙЧЫ ЗАЛАТАЯ



Фота БЕЛТА.

Другі залаты медаль на чэмпіянаце свету па летняму біятлону заваявала Наталля Сакалова. Да ўзнагароды вышэйшай пробы ў спрынце беларуска дадала «золата» ў масстарце на 5 кіламетраў. Сакалова зарабіла 4 штрафныя кругі, але гэта не перашкодзіла ёй фінішаваць першай на тры секунды раней за сярэбранага прызёра Алену Хрусталёву з Казахстана.

## ПЕРШЫ БЛІН НЕ КАМЯКОМ

Удалым аказаўся для беларускіх гандбалістаў стартавы матч першага кваліфікацыйнага раўнда Кубка кубкаў. У сталічным спарткомплексе ва Уруччы мінскі СКА выйграў у чэшскага клуба «Гумарны Зубржы» — 38:30. У складзе пераможцаў большую колькасць мячоў закінуў Барыс Пухоўскі (20). Матч у адказ каманда Спартака Міравовіча правядзе 8 верасня ў Чэхіі.

## ЧЭМПІЁН УЗМАЦНЯЕ ЛІДАРСТВА

Футбалісты барысаўскага БАТЭ зрабілі яшчэ адзін крок да другога запар тытула мацнейшай каманды Беларусі і чацвёртага ў гісторыі клуба. У 18-м туры дзеючыя чэмпіёны краіны выйгралі ва ўладальніка Кубка Беларусі брэсцкага «Дынама» — 2:1. Дарэчы, дынамаўцы зараз знаходзяцца ў аўтсайдэрах і рызыкуюць вылецець з эліты. А вось становішча БАТЭ вельмі моцнае: адрыў падначаленых Ігара Крыушэнкі ад бліжэйшага саперніка, сталічнага МТЗ-РІПО, складае 11 ачкоў (усяго каманда набрала 42 ачкі і мае матч у запасе). Мінчане ўпусцілі шанц крыху нагнаць лідара: трактаразаводцы прайгралі салігорскаму «Шахцёру» — 1:3. А менавіта гарнякі могуць адабраць у МТЗ-РІПО іх другое месца, бо ад яго каманду Юрыя Вяргейчыка аддзяляе ўсяго адно ачко (30 і 31). Вынікі іншых сустрэч: «Днепр» (Магілёў) — «Гомель» — 2:0, «Нёман» (Гродна) — «Віцебск» — 2:1, «Мінск» — «Дарыда» (Ждановічы) — 0:2, «Смаргонь» — «Тарпеда» (Жодзіна) — 0:0. Гульня мінскага «Дынама» і навапалацкага «Нафтана» перанесена на 26 верасня. Нагадаем, што 20 верасня БАТЭ правядзе ў гасцях у іспанскага «Вільярэала» матч Кубка УЕФА.

